***Валеўка Андрэй Віктаравіч,***
***аспірант кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ***

# СТАТУТ ВКЛ 1566 ГОДА Ў ПРАЦЭСЕ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ ПРАДСТАЎНІЧЫХ ІНСТЫТУТАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Адным з найбольш важных аспектаў гісторыі дзяржавы і права Беларусі з’яўляецца даследаванне гістарычных помнікаў права. Гэта дазваляе атрымаць больш поўнае ўяўленне аб асаблівасцях развіцця айчыннай прававой сістэмы і ўбачыць яе вытокі. Таксама, прававыя крыніцы пэўнага часу адлюстроўваюць узровень культуры грамадства, светапогляд народа і змены ў правасвядомасці.

Цікавасць уяўляе сабой перыяд уваходжання тэрыторыі сучаснай Беларусі ў склад Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Гэты час характарызуецца  ўздымам прававой і палітычнай думкі на беларускіх землях. Як адзначае Т.І. Доўнар, феадальная Беларусь – гэта велізарны гістарычны пласт, якому характэрны цікавыя з’явы і працэсы. У XV-XVI стагоддзях завяршаецца працэс фарміравання беларускай народнасці, у сферы дзяржауна-палітычнай складваецца саслоўна-прадстаўнічая манархія з яе характэрнымі рысамі і палітычнымі атрыбутамі, адбываюцца значныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, якія завяршаюцца цэлай серыяй рэформаў, у тым ліку і прававой. Вынікам адзначаных працэсаў з’явілася высокаразвітая прававая сістэма [1, с. 3]. Менавіта ў той час з’явіліся выданыя помнікі права: статуты ВКЛ.

Для сучаснай айчыннай прававой навукі важна вывучэнне узгаданых вышэй помнікаў права ў справе удасканалення розных прававых інстытутаў, а таксама развіцця правасвядомасці беларускага грамадства.

Тэматыцы статутнага перыяду права ў айчыннай гісторыка-прававой навуцы прывечаны шэраг даследаванняў, якія тычацца, у асноўным, развіцця канстытуцыйнага, крымінальнага, грамадзянскага права.

На аснове даследчай працы статутаў, выкананай навукоўцамі, у прешую чаргу, правазнаўцамі і гісторыкамі, можна зрабіць выснову аб вялікім значэнні гэтых прававых дакументаў у гісторыі беларускай дзяржаўнасці і права.

Мы звернем увагу на ўплыў статутаў на развіццё дзяржаўна-прававых інстытутаў у ВКЛ. Паколькі гэта шырокае пытанне, то мы спынімся на значэнні статутнага права ў развіцці парламентарызму ў дзяржаве, а таксама станаўленні шляхецкай дэмакратыі. Менавіта тут вялікую ролю адыграў Статут 1566 года.

Пытанні развіцця парламентарызму на тэрыторыі сучаснай Беларусі маюць вялікае значэнне для айчыннай юрыдычнай навукі, бо гэта тэма ніколі не згубіць сваёй актуальнасці. Парламенцкія інстытуты з’яўляюцца неад’емным элементам любой дэмакратычнай дзяржавы. Таму важна ведаць асноўныя заканамернасці развіцця прадстаўніцтва на нашых землях.

Статут 1566 года адметны тым, што ў ім упершыню рэгламентуецца дзейнасць сойма – галоўнага заканадаўчага органа ВКЛ: «При том тежъ уставуемъ, съ призволеньем радъ нашихъ духовныхъ и свецкихъ и зо всими станы сойму належачыми, на теперешнем сойму великомъ Виленскомъ, хотечы то все мети вечными часы, ижъ маемъ мы и потомки наши Великіе Князи Литовскіе съ потребы Речы Посполитое за радою радъ нашихъ того жъ панства, або за прозбою рыцерства, складати сеймы вальные въ томъ же панстве Великомъ Князстве Литовскомъ завжды, коли колко того будеть потреба» [5].

На думку М. Доўнар-Запольскага, менавіта з моманту ўхвалення Статута 1566 года можна казаць пра ўзнікненне Сойма ВКЛ як вышэйшага органа дзяржаўнай улады [2, с. 51]. Даследчык удакладняў, што развіццё сойму звязана з барацьбой вялікіх князёў з удзельнымі князямі з апорай на рыцарства. У сілу палітычных акалічнасцяў ужо пры першых князях выпрацаваўся звычай склікаць увесь ваенна-служылы клас уласна Літвы на нарады, веча, соймы [2, с. 52]. Вядома, гэта былі вельмі неарганізаваныя зборы, якія складаюцца з выпадковага зборышча людзей. Першапачаткова яны збіраліся, як мы бачылі, з прычыны палітычных падахвочванняў, якімі кіраваліся вялікія князі, і рашэнні такіх збораў для вялікіх князёў не былі абавязковыя. Першапачаткова гэтыя зборы выяўлялі толькі меркаванне баярства ўласна Літвы. Але прывілей Казіміра 1447 г. ствараў ужо абавязак для гаспадара склікаць шляхту на соймы, калі яму патрэбны былі сродкі [2, с. 52]. Гэтым самым для шляхты стваралася прывілеяванае становішча ў параўнанні з іншымі класамі. Соймы і пасля 1447 г. да рэформаў 1566 г. насілі такі ж неарганізаваны характар. Такім чынам, Статут заканадаўча замацоўваў стан Сойма.

Акрамя рэгламентацыі дзейнасці агульнадзяржаўнага сойма, Статутам 1566 года ўпершыню замацоўваюцца пастановы аб павятовых сойміках. Згодна з артыкулам 5 раздзела III, у галоўных месцах (сталіцах) за чатыры тыдні да вальнага сойму склікаліся павятовыя соймікі. На іх шляхта выбірала са свайго асяроддзя па два дэпутаты на сойм, абмяркоўвала розныя мясцовыя пытанні, а таксама тыя пытанні, якія яе турбавалі, і фармулявала адпаведныя прапановы [5].

Аднак, Статут поўнасцю не адлюстроўваў сістэму соймікаў, бо там не было ніякіх пастаноў аб парадку іх працы і інш. [4, с. 50] Па сутнасці, усе гэтыя пытанні рэгуляваліся практыкай і звычаем, якія часткова былі запазычаны з Польшчы [4, с. 50]. З цягам часу ў ВКЛ збіралася шмат

практычнага матэрыялу, рабіліся высновы з праблем, звязаных с працай соймікаў. Дзякуючы гэтаму, шляхта пачала прымаць большы ўдзел у вырашэнні важных палітычных пытанняў, што паступова павышала ўзровень яе палітычнай і прававой культуры.

Такім чынам, можам зрабіць выснову, што Статут ВКЛ 1566 г. адыграў значную ролю ў станаўленні і развіцці прадстаўніцтва на беларускіх землях і з’яўляецца адным з выдатнейшых помнікаў права Беларусі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Доўнар, Т.І. Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588гг.) : вучэбны дапаможнік / Т.І. Доўнар. – Мінск : Белдзяржуніверсітэт, 2001. – 76 с.

2. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994. –510 с.

3. Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: Матэрыялы міжнар. навук. канферэнцыі (Мінск – Наваградак, 23–24 лістапада 2007 г.) / Навук. рэд. С.Ф.Сокал, А.М.Янушкевіч. — Мінск: БІП-С Плюс, 2008. — 374 с.

4. Рахуба, А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569-1793 гг. / А. Рахуба; пер. с пол.мовы М. Раманоўскі; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск: Медысонт, 2008. – 424 с.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года (вытрымкі з выдання: Статут Великого князьства Литовского 1566 года и поправы статутовые 1578 года // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. – 1855. Кн.25. С. 1-242) – [Электронны рэсурс] –

Рэжым доступу: http://www.pravo.by/main.aspx?guid=1831. –Дата доступу: 20.02.2016.